ноябрь 2007 № 1



# Nika

*Aura academica*

Газета студентов Истфака



**Рэдкалегіі.** Па-першае, яна павінна быць цікавай, змястоўнай і галоўнае – прафесіянальнай. Прафесіянальнай не толькі з пункту гледжання журналістыкі, тут яшчэ можна і павучыцца. Прафесіянальнай – з боку гістарычнага, як газета гістарычнага факультэта, ва ўсіх сферах, якія асвятляюцца. Газета павінна адлюстроўваць усе бакі студэнцкага жыцця. Галоўнае, пры ўсім іншым ва універсітэце – вучоба і навука, ці навука і вучоба. Вядома вы скажаце: а каханне, а сяброўства, а эмоцыі, а погляды? Безумоўна, і гэтыя сферы жыцця студэнцтва не павінны заставацца па-за ўвагай газеты. Але пры ўсім тым – ва ўсіх газетах першыя старонкі афіцыйна-інфармацыйнага кшталту – на першым плане вучоба і навука. Як захапіць студэнта навуковым даследаваннем? Бо навука – не толькі сумныя кніжкі. Гэта вопыт ўласнага пошуку, разважанняў, даследавання. Гэта тое, што не забываецца з адзнакай у залікоўцы. Навіны навукі, у тым ліку гістарычнай – без натацый, без залішняга "цытатніцтва" павінны быць на першым плане. Газета павінна абмяркоўваць бягучыя пытанні вучэбнай работы і жыцця студэнцтва. Не баяцца ставіць вострыя пытанні, але адначасова знаходзіць адказы, падштурхоўваць студэнцтва да вырашэння наспелых праблем.Прафесіяналізм павінен прысутнічаць ва ўсіх раздзелах. Дылетанцтва ды голыя разважанні, павярхоўнасць і выключны эклектызм не будуць ствараць гонару газеце. Яна павінна не раз'ядноўваць, а аб'ядноўваць, ствараць, а не разбураць, падштурхоўваць, а не падбухторваць. Адказнасць за сказанае і напісанае, за тое, як "у сэрцы кожным адзавецца" павінна абавязкова ў газеце прысутнічаць. І яшчэ: газета павінна быць інфармацыйнай, своечасова інфармаваць аб надзённых праблемах і клопатах. У сувязі з тым, можна было б друкаваць толькі яе юбілейныя выпускі, а астатнія размяшчаць на афіцыйным сайце гістарычнага факультэта.

Поспехаў у творчасці!

**С. М. Ходзін**

## С днем студента!

**Здравствуй, Истфак!**

Мы, студенты, уверены, что на нашем факультете есть все: самые лучшие преподаватели, креативные студенты и особая атмосфера студенческой жизни. Но до сих пор не было Одной… Мы решили это исправить. И сегодня мы рады представить Ее вам. Знакомьтесь, специально для вас и о вас – Nika. Перед вами первый номер студенческой газеты исторического факультета. Здесь каждый найдет для себя что-то интересное и сможет привнести в нее что-то свое. А пока мы предлагаем вашему вниманию следующие рубрики: самая актуальная информация на нашей «Информационной страничке»; свежий взгляд на интересные места нашей Родины и зарубежья в рубрике «Па цікавых мясцінах»; наболевшие вопросы студенческой братии и честные ответы преподавателей в «Обратной связи»; последние события культурной жизни страны и творчество наших студентов в «Арт-клубе» и «Таленты гісторыка»; о великом и курьезном вам расскажет сама Клио в своей рубрике; а также в газете вы узнаете о всех достижениях факультета. Мы надеемся, что Nika сможет занять достойное место на историческом факультете и в сердце каждого читателя. Просим всех поддерживать наши начинания, и приглашаем к сотрудничеству. А если вам есть что рассказать факультету: если вы на досуге открыли Эльдорадо, встретились со Снежным человеком, совершили плавание в Атлантиду, если понимаете о чем говорит О. В. Перзашкевич, то мы ждем вас. А если серьезно, то мы будем рады любым предложениям, замечаниям и вашим интересным идеям.

P.S. Обращайтесь в редколлегию или на e-mail: nika-hist@mail.ru.

**Редколлегия**



Не так уж часто встретишь людей с задатками истинного лидера. Но мне, как и всему историческому факультету, в этом плане очень повезло. Среди студентов-историков есть такие, без участия которых, не состоится ни одно мероприятие. Их «творческому гению» по плечу все: от веселых и задорных студенческих концертов до благотворительных акций. Я думаю, что у многих из нас начали возникать в подсознании образы таких людей. И большая часть, уверена, представила именно его – Тараса Моха (кстати, чтобы взять интервью, мне пришлось отвлечь его от очередной благотворительной акции).

## Поздравляем!

*Тарас, ты много добился в университете, расскажи с чего ты начинал?*

- Мне повезло, что я попал в блок к студсовету, где я сдружился с ребятами, благодаря чему быстрее влился в студенческую жизнь.

*Ты занимаешь ответственные должности: председатель Студенческого Союза на историческом факультете, член Студсовета, староста группы и т.д. Как ты всюду успеваешь?*

- У меня есть команда друзей и единомышленников: это мои одногруппники и младшие курсы, с которыми легко найти общий язык.

*Небось, от поклонниц отбоя нету?*

- Я считаю, что в организации должны быть только деловые отношения. И у меня есть девушка, которая пресекает все мои попытки “ходить налево” (улыбается).

*А что ты считаешь самым большим достижением в университете?*

- У меня нет врагов, и нет человека, которого я бы обманул или подвел.

*Достаточно смелое выражение.*

Все не без греха, кто согрешил меньше, пусть первый бросит камень (смеется).

*Я думаю, для наших читателей будет интересна, что тебя подтолкнуло к участию в конкурсе «Лидер года», и как ты достиг победы?*

- Это было сатисфакция за 3-е место в конкурсе «Супермен» и доказать себе, что если человек чего-то очень хочет добиться, то несмотря на преграды может выиграть и стать лидером.

*Тарас, ты уже на 5 курсе, чем ты дальше планируешь заниматься? Связываешь ли ты свое будущее со специальностью?*

- Наша жизнь – это игра, в которой ты не знаешь, где выиграешь, где проиграешь, в которой ты не знаешь, что ждет тебя за поворотом и, что ждет впереди. Не знаю, в какой сфере я проявлю себя, но буду всегда стремиться к самосовершенствованию.

*Может ты раскроешь секрет своего успеха для «начинающих лидеров» Истфака?*

- Позитивное настроение, позитивное мышление, стараться ни с кем не ругаться, ни на кого не обижаться и вставая утром, смотря в зеркало говорить, что ты самый лучший.

*Тарас, что ты пожелаешь читателям и самой газете?*

- Газете - продолжать начатое дело (не бросать, доводить да конца). А читателям - выглянуть в окно и посмотреть, на сколько красива жизнь.

**Беседу вела Василевская А.**

---

**ПРО ПОЛОЖЕНИИ**

*о скидках со сформированной стоимости обучения, предоставляемых студентам платной формы обучения Белорусского государственного университета*

Настоящее Положение регулирует порядок предоставления студентам БГУ скидок со сформированной стоимости обучения

При этом скидка может быть предоставлена только при одновременном наличии высоких показателей как в учебно-познавательной деятельности, так и научно-исследовательской и общественной работе.

2.4. Под высокими показателями в общественной работе понимаются:

2.4.1. активное участие в работе следующих молодежных общественных организаций и органов студенческого самоуправления, первичной профсоюзной организации студентов, действующих в БГУ:

первичная организация «БРСМ» БГУ; первичная профсоюзная организация студентов БГУ; общественное объединение «Студенческий союз БГУ»; Студенческий совет по качеству образования БГУ; Совет старост БГУ; Совет по профилактике нарушений Правил внутреннего распорядка в общежитиях Белорусского государственного университета; Координационный совет Студенческих советов общежитий БГУ; добровольная народная дружина БГУ; студенческие советы общежитий, старосты этажей общежитий; студенческая служба безопасности БГУ, оперативные отряды общежитий, оперативный отряд профкома студентов.

Участие в разных мероприятиях, проводимых университетом.

аличие необходимых показателей.

Вне зависимости от даты издания приказа скидки, предоставляются студенту с 1 сентября на один учебный год. *Уважаемые студенты, полный текст Положения вы сможете найти на сайте нашего факультета* ***hist.bsu.by.***

2007
ноябрь
Арт-клуб
NIKA 7

# ЧАРГОВЫ КУЛЬТПАХОД

Дзіўнае студэнцкае жыцце! Яго надзвычайная хуткасць, часам хаатычнасць і “ідэя фікс” - паспець усе некаторым здаюцца неверагоднымі, а можа нават і бессэнсоўнымі. Для саміх жа студэнтаў такі лад існавання - норма: заняткі ва універсітэце, “паломніцтва” ў бібліятэку, сустрэчы з сябрамі, добрая палова свабоднага часу ў “сусветнай павуціне” і шмат іншых дробязяў. Але калі-нікалі хочацца сказаць сабе “стоп” і заняцца нечым такім, што супакоіць і залагодзіць, на пэўны час акуне ў іншае, больш памяркоўнае вымярэнне. Для мяне такая панацэя - тэатр.

Вось мы аднойчы і згуртаваліся з сяброўкамі і вырашылі ажыццявіць чарговы незапланаваны культпаход у Купалаўскі тэатр. Выбар спектакля не быў прынцыповым, а так як мы натуры даволі рамантычныя (а часам слязлівыя), то нас зацікавіла пастанова з адпаведнай назвай - “Каханне ў стылі барока”. Шматлікія ж пазітыўныя водгукі маіх знаемых ў адрас пастаноўкі пацвердзілі правільнасць нашага выбару. Але, шчыра кажучы, назва неяк не вязалася да жанру (камедыя) і мне здавалася, што гэта будзе нешта дастаткова сур’езнае і нават празмерна ўзнеслае. Але тое, што мы з сяброўкамі ўбачылі, перавысіла ўсе магчымыя і немагчымыя чаканні.

Пачатак спектаклю адразу паказаў - нас чакае амаль тры гадзіны цудоўнага настрою. Сюжэт развіваўся імкліва: да вельмі эфектнага і прывабнага пана прыязджае яго нарачоная. Але справа ў тым, што бачыліся яны толькі аднойчы (яшчэ ў дзяцінстве), і сустрэча



гэтая не была адназначнай: калі для паненкі гэта каханне з першага погляду, якое яна пранесла праз доўгія гады растравання, то для пана асноўным успамінам была шкадлівая і разбэшчаная дзяўчынка, якая заўседы вельмі шчыра плакала. Аднак ажаніцца яны павінны былі абавязкова: такім было жаданне іх бацькоў-нябожчыкаў. Таму і вырашае пан пайсці на хітрык: выстаўляе замест сябе ў якасці жаніха свайго псара. Бедалага! Не ведаў яшчэ, што колішняе непрывабнае і надаедлівае куранё ператварылася ў надзвычай прыгожага і грандыезнага лебедзя...

Вось вам і каханне ў стылі барока - мудрагелістае, дзіўнае! Героям трэба прайсці шмат выпрабаванняў, часта вельмі камічных, каб у рэшце застацца разам назаўседы. Так адбылося і з галоўнымі героямі спектакля. Нягледзячы на тое, што гэта камедыя, было ў ёй шмат лірычных і даволі рамантычных момантаў. Таму і не дзіўна, што ўзятыя загадзя хусцінкі нам з сяброўкамі спатрэбіліся.

Спектакаль скончыўся шчасліва. І мы, такія ж шчаслівыя, пакідалі з дзяўчатамі сцены тэатру. Яшчэ доўга ішло нашае надзвычай жывое абмеркаванне ўбачанага, гэтак жа доўга і вельмі аддана мы дзяліліся сваімі ўражаннямі. Але ўсе ж такі прыйшлі да агульнай высновы: кожнае каханне па прыродзе сваей дзіўнае. Іншая справа, ці ўсё мы робім для таго, каб убачыць яго - сапраўднае каханне, ці хапае нам сіл з гонарам прайсці ўсе выпрабаванні, якія яно нам падрыхтавала. Таму ўсе на спектакль “Каханне ў стылі барока”! Ён не пакіне вас абыякавымі. Больш таго, дасць матэрыял для разважанняў.

Гарантую!

**Ірына Бачыла.**

# ...і смех, і каханне, і нянавісць, і помста.

Я не заядлая тэатралка, але добры спектакль, як добрая кніга, якую ёсць жаданне чытаць і чытаць. Ці задумваліся вы, што можа прымусіць чалавека стаць нібы звер, які забыўся на ўсе этычныя законы? І ўжо сам сабе не рады і хочаш спыніць водаварот інтрыг, здрадаў, забойстваў і помст. Дзеля гэтага нават сыходзіш у кляштар, але ўсё дарэмна і ніхто не верыць твайму пакаянню, і старыя памылкі знаходзяць цябе і тут, і няма спокою.

Прыкладна такая завязка сюжэту спектакля “П’емонцкі звер” А. Курэйчыка, што ідзе ў Тэатры беларускай драматургіі. Выдатны спектакль: адбываецца поўнае адчуванне атмасферы сярэднявечнага кляштара. Тут ёсць усё: і смех, і каханне, і нянавісць, і помста. Адзінае, што ў самым канцы спектакля ёсць невялікая гістарычная недакладнасць. А ты, студэнт гістфаку, знойдзеш яе?

**Ганна Валынец.**

Где вороны кричат от холода, без хлеба,
Где властвуют законы темноты
Я корни отрываю, улетаю в небо
Я больше не могу так жить, как ты.

Я солнца прагну, или лучик света.
Я правды выпить приподняла Грааль
Не требую я, чтобы не кончилось лето,
Но только чтобы не исчезло вдаль.

Понимаю, что обязана я корню кровью,
Но не желаю быть его рабом
И в поисках надежды, счастья, новой жизни,
Я покидаю старый, отчий дом.

**Якименко Мария**

**На ветру. Подоконник.**

Затаенно, мучительно, остро –
Словно волки скулят на луну.
Я продрогла от холода костно,
Прислонившись к ночному окну.
Завтра звездной не будет муки –
Только серые зубья дня.
Я тогда закричу от скуки,
Но, наверное, про себя.
А пока в этот лунный полдник –
Глотками холодный чай.
На разветренный подоконник
Свою тень оброню невзначай.
Затаенно, мучительно, остро –
Словно волки скулят на луну
Я продрогла от холода просто.
Затерялась в осеннем саду.

**Н.Н**

**Старыя багі**

Я бачу ізноў,
Як цемная кроў
Сцякае на мятыя травы.
Завуць кухароў
Пад грукат падкоў
Пагрэць прызабытыя стравы.
Старыя багі
Узнялі сцягі,
Ім хочацца свежай ахвяры,
Ліхою вясной
У цемры лясной
Яны нарадзілі пажары.
У самы гушчар,
Пад сховішча чар,
Сцякаюцца верныя людзі,
Замшэлы алтар
Разбудзіць святар,
І ў троны свае сядуць суддзі.
Магутнасць муроў
Для сілы дуброў
Ужо не заступіць дарогі,
У люты паход
Ліхі свой народ
Паднімуць забытыя богі.

**Быль Віталій**



Закрою глаза, чтобы увидеть рассвет,
Но боль нарисует другое:
Где жизнь без меня, где тебя больше нет,
Стирая места, где мы двое.
А холод сожжет, что когда-то могло
Гореть по утрам ярче солнца -
Глаза, где теперь лишь одно:
Когда же ко мне он вернется.

**П.А.**

# Любчанскі замак.



**Ад прадзедаў спакон вякоў
Нам засталася спадчына...**

На тэрыторыі Беларусі ёсць шмат помнікаў дойлідства і архітэктуры, якія патрабуюць рэканструкцыі. Адным з гэтых помнікаў з’яляюцца былы Любчанскі замак. Нават не замак, а яго рэшткі.

Будаўніцтва замка пачалося, відавочна, у 1581 г. (аб чым сведчыць выява даты на флюгеры) пры Яне Кішку і закончана ў пачатку 17 ст. пры Радзівілах. Замак быў змураваны з цэглы і каменю на левым, умацаваным валуамі, высокім беразе Немана. У плане - чатырохвугольнік, абкружаны з трох бакоў ровам шырынёй да 30м і глыбінёй 7 – 10 м. Роў злучаўся з ракой. Вуглавыя вежы, палац і крапасныя сцены таўшчыней да 1,8 м утваралі ўнутраны двор. З цягам часу замак прыйшоў у заняпад, захаваліся дзве вежы (заходняя і паўднёвая) і флігель палаца.

З 13 па 27 жніўня 2007 г. ў Любчы праходзіў валанцёрскі летнік, арганізаваны МГА “Гісторыка”. За два тыдні у аднаўленчых працах на замку паўдзельнічала больш за 120 чалавек з усёй Беларусі: валанцёры працавалі ў Любчы хто колькі мог – хто тыдзень, хто два, хто пару дзён, агулам на замку стала прысутнічала каля 40-60 маладых людзей.

Працы ў летніку вяліся ад ранку і да захаду сонца. Нават выходны дзень – нядзеля – быў аддадзены на карысць агульнай справы: частка ўдзельнікаў летніку сабраліся на супольнай малітве, частка далучылася да грандыёзнага мерапрыемства мясцовых уладаў – раённых Дажынак.

Вяліся працы не толькі па адраджэнню былога замку, але і духоўнасці ўдзельнікаў рэканструкцыі. Духоўнае кшталтаванне ўдзельнікаў летніку адбывалася дзякуючы не толькі супольнай працы, але і разнастайным культурным мерапрыемствам. Асабліва насычанымі і пазнавальнымі былі вечары ў Любчанскім замку, калі чыталіся лекцыі на гістарычныя тэмы, адбываўся прагляд мастацкіх фільмаў, ля вогнішча ладзіліся паэтычныя імпрэзы, гучалі спевы пад гітару, флейту і дуду, ладзілася навучанне народным танцам.

Любчанскі замак ўздымаецца з руін у асноўным дзякуючы рукам моладзі. Яна прыязджае з розных гарадоў, бескарыслівa дапамагае і просіць не заставацца на дасягнутым. Не абыходзіцца пакуль без праблем, выкліканых недахопам фінансавых сродкаў у фонду “Любчанскі замак”. Гэта тлумачыцца тым, што няма падтрымкі з боку дзяржавы. Грашовыя сродкі, якія накіраваны на аднаўленчую працу, атрымоўваюцца ад людзей, якім не ўсе роўна будучыня гістарычных помнікаў. На жаль, гэтых людзей вельмі мала.

У наступным годзе, летам, некаторыя студэнты гістарычнага факультэта Беларускага Дзяржаўнага універсітэта па свайму жаданню скіруюцца ў Гродзенскую вобласць Навагрудскі раён на аднаўленчую працу ў Любчу. Мы запрашаем прыняць ўдзел усіх жадаючых у аднаўленні замка. Гэта прынясе карысць не толькі нам, ўдзельнікам аднаўленчай працы, але і вам, сябры.

**Студэнты 1 курса
Пашкевіч Майя ,
Суша Павел.**

**Последнее время актуальным стал вопрос по наиболее подходящей форме КСР. С этим мы обратились к преподавателям и студентам нашего факультете.**



*Темушев Степан Николаевич.*

*Ваше мнение о КСР. Какие формы и методы предпочитаете?*

В целом скажу: наверное, определенный период КСР отводилось ненужное количество времени. Слишком много времени отводить на самостоятельные работы студентов в условиях нашего региона, я думаю, не стоит. Может быть, на Западе это бы и проходило, но у нас, учитывая восточнославянский менталитет, когда в большей степени рассчитывают на халяву, на многое рассчитывать от самостоятельных работ студентов не приходится. Легче дать это в разжеванном виде: лекции, работы на семинарских занятиях, когда есть конкретный перечень вопросов, конкретные требования предъявляются студентам, да за это ещё оперативно выставляются оценки. Это имеет гораздо больший эффект. В этом отношении система, которая господствовала раньше, была более эффективна. Может, КСР и необходима как самостоятельная работа, при этом студентов нужно контролировать постоянно и очень серьёзно.

Формы КСР… Скажу сразу: я не приемлю, по понятным причинам, рефераты. Они уже отжили свое время. Очень просто можно найти базу рефератов. Поэтому, лучше всего тестирование, но у него тоже много отрицательных моментов. Например, элемент отгадывания. В тоже время есть и положительные моменты: все одновременно отвечают на одни и те же вопросы, оценка получается объективная, без участия каких-либо преподавателей. Но в то же время с помощью тестов не возможно проверить мышление студентов, умение выстраивать причинно-следственные связи, делать выводы, давать свою личную оценку, а это очень важно. Поэтому последнее время, я лично, в своей работе использую такую форму, как написание аннотации с элементами рецензирования. Благодаря этой форме я могу заставить студентов прочесть эту книгу (ну я надеюсь, что так и происходит) или хотя бы с ней детально ознакомиться. Монографии выбираю сам, новейшие, естественно. Аннотация именно с элементами рецензирования: в ней прослеживается, как и то, что студент прочитал эту книжку, так и то, как он относится к тем или иным положениям, которые он встретил в ней.

На 3 курсе я уже использую другую форму - это эссе. Даю формы, которые, опять же, требуют личного отношения и темы, которые невозможно не откуда списать. Но тем не менее, с этим связан ещё один момент: я всегда принимаю работу только в письменном виде, не в коем случае не распечатки. Если даже где-то нашли в электронном виде, переписывая, все равно в голове что-то останется. Опять же тренируется скоропись у человека и т.д. Тоже полезно.



*Балыш Максім, студэнт 3 курса.*

Адназначную адзнаку па гэтаму пытанню даць вельмі складана, бо КСР як форма кантролю ведаў існуе ўжо даволі працяглы час. А паколькі ў нашым кансерватыўным грамадстве штосці змяніць даволі праблематычна, прасцей выкарыстоўваць старыя правераныя метады, нават калі яны ўжо не адпавядаюць патрабаванням часу і малаэфектыўныя. Што тычыцца майго пункту гледжання, то трэба адасабляць розныя віды КСР. Тэсты ніколі не змогуць даць станоўчых вынікаў, паколькі яны разлічаны на машынальнае вызначэнне ведаў. Яны прызначаны для студэнтаў, якія ў стане вывучыць пэўную колькасць фактаў. КСР у форме рэферата зыходзіць з таго, што студэнты самастойна падбяруць матэрыял і на падставе крыніц і манаграфій падрыхтуюць навуковую працу ў вызначаных выкладчыкам памерах. Аднак мы ўсе ведаем, як робяцца гэтыя “навуковыя працы”. КСР у форме эсэ павінна вызначыць стаўленне саміх студэнтаў па вызначанай прабleме. Калі выказваць толькі свае думкі, то ці з’яўляецца гэта сапраўды навуковай працай? Калі ж выказваць свае думкі зыходзячы з фактаў, пазіцый іншых даследчыкаў, то чым жа тады эсэ адрозніваеццца ад рэферата? І канешне КСР у форме калоквіума. Гэта форма ператвараецца ў звычайнае факталагічнае апытанне. Чаму так атрымоўваецца, трэба спытаць у выкладчыкаў.

*Продолжение на стр. 5.*



*Даўгяла Міхаіл Сцяпанавіч.*

*Як Вы адносіцеся да КСР?*

Ёсць розныя формы яго правядзення. Усё залежыць ад выкладчыка. Адзін паважае рэфераты, другі – тэставыя заданні, трэці – праводзіць калоквіум, чацвёрты – напісанне эсэ і г.д. Зараз распаўсюджана такая думка, што лепш выкарыстоўваць тэставыя заданні. Аднак, часу на падрыхтоўкуда яго няма. Гэтатак званы бягучы КСР: сёння семінар і я раблю аб'яву, што на наступным семінары пішам тэст. А калі б у студэнтаў быў час на падрыхтоўку – вынікі былі б лепшымі. Адказ на пытанне тэста можна ўгадаць, але гэта не заўсёды. Я, карат кажучы, адмоўна адношуся да гэтай формы. Гэта звязана з тым, што няма часу на яго падрыхтоўку, адсутнасць аўдыторый, падрыхтоўка да наступных заняткаў.Студэнт павінен рыхтавацца да КСР ці семінара. КСР – прамежкавы залік, а для заліку патрэбен час. Што тычыцца напісання і абароны рэферата, то тут у студэнтаў ёсць час. Вы яго чытаеце, абараняеце, выносіце пытанні для абмеркавання. Не павінна супадаць на адным тыдні некалькі КСР. Гэта рэгулюе метадычная камісія. Студэнты павінны ведаць дакладна дату КСР. Адзнака па КСР павінна ўплываць на адзнаку на іспыце: калі вы атрымалі 8, то як мінімум 8 павінна быць вам гарантавана. Але не заўседы так атрымрўваецца. КСР з'яўляюцца прамежкавым залікам, таму іх,на маю думку, трэба праводзіць у канцы заняткаў – на апошнім семінары, калі пройдзены ўсе тэмы. *Наколькі адзнакі па КСР супадаюць з адзнакамі на іспыце?* Як паказвае практыка, бываюць вельмі розныя адзнакі па КСР. Я магу іх вам паказаць, бо яны, акурат кажучы, ёсць на кафедры. Але гэта не заўсёды адлюлюстроўвае веды студэнтаў. Таму я ўлічваю працу на семінарах. Ва ўсякім выпадку я падтрымліваю студэнтаў: выношу на КСР пытанні, якія разабралі на семінарах, практыкую выстаўленне "аўтаматам", але калі за КСР атрымана дрэнная адзнака – я не магу гэта зрабіць. *А як Вам рэферат у якасці КСР?* Адзнакі па рэфератах лепшыя, бо вы да яго рыхтуецеся і маеце час, каб яго падрыхтаваць. Але нажаль студэнты не заўсёды могуць правільна яго напісаць. Вы можаце выбраць самі тэму, параіцца з выкладчыкам, знаёміцца з асноўнай і дадатковай літаратурай. Спачатку я знаёмлюся з рэфератам, а потым студэнт яго абараняе, таму проста "скачаць" не атрымаецца. Ёсць яшчэ і калоквіум. Гэта франтальнае апытанне. Але тут пытанні адрозніваюцца паміж сабой: фактычныя – "калі" і тэарытычныя – "якія прычыны". Угадаць іх немагчыма. Для адзнакі адказы павінны суміравацца ў канцы калоквіума. *Дзякуем Вам за шчырыя адказы.*



*Алексеенко Олег, студент 4 курса.*

Наверное, не стоит давать однозначную оценку организации КСР не только на историческом факультете, но и в университете в целом. Дело в том, что по результатам недавнего опроса среди студентов, которое, кстати, проводил СКО, система КСР оказалась не в самом выгодном свете. В анкетировании принимал участие каждый десятый студент факультета. Результаты были представлены в процентном отношении и сгруппированы следующим образом: 1 курс и 2-5 курс. Студенты 1 курса, составляли 20% опрошенных. Среди студентов старших курсов доля тех, средний балл которых составляет от 8 до 10 – 48%, т.е. почти половина опрошенных неплохо проявили себя в учебе. На вопрос: «Какие формы образовательного процесса и контроля знаний наиболее эффективные?», - полезной КСР посчитали только – 19%, а не нужной – 35%. Мне кажется, что дело в том, что советская система образования, которая действует у нас, больше ориентирована на вход (учебный план с количеством часов ) и не имеет жесткой системы оценки результата на выходе. В англо-американской системе все наоборот: есть четкая система дескрипторов на выходе. Они позволяют оценивать знания не по количеству прослушанных часов, а по количеству набранных кредитов - и гораздо лучше замкнуты на компромисс между требованиями работодателя и возможностями учебного заведения. К тому же эта система ориентирована на самостоятельную работу, а советская – на аудиторные занятия, которые, кстати, по результатам того же опроса, 82% считают полезными. Вот и получается: вводим КСР, а навыков самостоятельной работы – нет!

8 NIKA Усмешка спадарыні Кліо 2007 ноябрь

Рассказывают, что, оказавшись в Париже, Петр I посетил гробницу кардинала Ришелье и, обращаясь к его статуе, воскликнул:
- Великий человек, живи ты в мое время, я отдал бы тебе половину моего царства, чтобы ты научил меня управлять другой половиной! Напрасно! — заметил кто-то, — Он бы и другую половину прибрал к рукам.

Если судить по вашим словам, то история изучает всё: квантовую механику, устройство утюга, маршрут Пацы-Вацы…

***

Если бы история изучала всё, был бы один факультет – НАШ!!!

***

У наших компьютеров есть один недостаток, который подключается к нему через клавиатуру и мышь – пользователь называется.

***

Что для луны 100 тысяч лет – ничего! Только пыль сдуло… Да и то не везде.

***

П: - Кто "большой друг" евреев?
Студент: - Новуходоносор!
П: -Он, конечно, сволочь редкая…

***

Сусанин изменил славянским принципам в угоду национальным интересам

***

Предмет ЧОГ – калейдоскоп издевательств.

***

Что, непонятно написал? Ай, нехороший какой! (о Хаммурапи).

**Перзашкевич О.В.**

В 1797 г. один из членов Директории, правившей в те годы Францией, вздумал основать новую религию, которую он назвал "теофилантропией". Талейран, выслушав его проект, сказал: "Позволю себе сделать одно замечание: Иисус Христос, чтобы основать новую религию, умер на кресте и воскрес; я полагаю, что вам надо попытаться сделать то же самое".



Когда в 1740-е годы Казанова во второй раз после годового отсутствия приехал в город Орсару, местный врач бросился к нему на шею с криком: «Благодетель мой, не привезли ли вы еще чего-нибудь новенького?», ибо после первого визита Казановы он был обеспечен практикой на весь год.

Если Вы замените Трояна, то и Вас заменят.

***

Учитесь, учитесь, я вам не сочувствую.

**Корзун М.С.**

А цяпер давайце абцяжарымся гісторыяй.

**Лойка П.А.**

*Может и в вашей коллекции найдется, чем порадовать наших читателей?!*

Мнения авторов могут не совпадать с мнением редакторов. Ваши замечания, предложения присылайте на nika_hist@mail.ru.
Звоните: +375297729065; +375293233693; +375297611559.

**Редколлегия:**
Василевская Анна
Врублевский Дмитрий
Зайцев Дмитрий
Алексеенко Олег
Анацко Дмитрий
Быль Виталий
Красногорская Елена

**Верстка:** Шлемен Е.С.
**Адрес редакции:** 220050, Минск,улица Красноармейская,6.
**Тираж** 70 экз.
Распространяется бесплатно.